**Aleś Bielski**
*Białoruski Uniwersytet Państwowy w Mińsku*

# ЭЛІЗА АЖЭШКА І ПАЭТЫЗАЦЫЯ НЁМАНА Ў БЕЛАРУСКАЙ ЛІРЫЦЫ

Нёман можна разглядаць як спрадвечны вобраз у духоўна-філасофскай мадэлі быцця. Ён стаў значным культурна-гістарычным сімвалам. Рака Нёман з'яўляецца паўтаральным топасным вобразам-матывам у мастацкай творчасці ад XIX – пачатку XX стагоддзя і да нашых дзён. Уласна кажучы, пра гэта яскрава сведчыць вялікі тэкставы матэрыял зборніка «Бацька наш Нёман»[1], які склалі творы разнастайнай родава-жанравай прыналежнасці. Вобраз Нёмана знайшоў паэтычнае ўвасабленне ў творах А. Міцкевіча, У. Сыракомлі, Я. Лучыны, Я. Коласа, А. Гурло, Ц. Гартнага, Я. Пушчы, А. Астрэйкі, П. Пестрака, Л. Геніюш, А. Русака, Р. Барадуліна, Д. Бічэль, В. Іпатавай, Ю. Голуба, К. Камейшы, М. Маляўкі і інш. Нямала можна прывесці вобразных, маляўнічых радкоў, акваматываў, прысвечаных Нёману, аднаму з самых значных беларускіх пейзажных топасаў.

Аднак гэтая рака ў мастацкай свядомасці больш чым аб'ект паэтызацыі і захаплення. Яшчэ Я. Купалам Нёман атаясамліваўся з родным краем, быў для паэта велічным сімвалам Радзімы-Беларусі: «…Дзе бяжыць бурлівы Нёман, // Дзе наш родны край!»[2] («Усе разам»). Я. Колас звяртаецца да Нёмана нібы да жывога, гаворыць пра яго як саўдзельніка чалавечага быцця, пры гэтым рака паэтызуецца, яе вобраз набывае падкрэсленую сімвалічнасць і шматзначнасць: «Льецца Нёман паміж гораў, // Поўны сілы і красы…»; «О, наш чысты, наш свабодны

---

[1] Бацька наш Нёман: Вершы, апавяданні, нарысы, эсэ. Уклад. Я. Хвалей, Мінск, 2001, 510 с.

[2] Я. Купала, Поўны збор твораў: У 9 т., Мінск, 1995, т. 1, с. 100.

// Нёман, быстрая рака!»[3] («Нёман»). Нёман успрымаецца Коласам у духоўна-камунікатыўным і прасторава-часавым вымярэнні як пасланец-сувязны: «Ты цячэш далёка, знаю, // Ў зямлю Літвы і нямцоў… // Раскажы ж чужому краю // Пра жыццё тваіх сыноў!»[4].

Зварот пісьменнікаў да навакольнай прыроды з яе хараством меў выключна важнае значэнне для духоўнага і эстэтычнага станаўлення літаратуры XIX – пачатку XX стагоддзя: як польскай, так і беларускай. Асабліва каштоўным спасціжэнне прыродна-пейзажнага свету было для нацыянальнай мастацкай свядомасці, яе працэсу афармлення і развіцця. На гэтую акалічнасць звярнуў увагу В. Каваленка, які справядліва адзначыў, што наша літаратура «не магла вырасці ў самастойнае творчае фарміраванне без глыбокага ўнутранага захаплення прыгажосцю роднага краю. Прычым захапленне гэта ўзнікла ў пісьменнікаў як вынік перажывання»[5]. Літаратура адкрывала людзям нашага краю іх радзіму, Бацькаўшчыну, уплывала на іх эстэтычнае ўключэнне ў ландшафтна-прасторавую сферу быцця. Дзякуючы ёй у духоўна-ментальным мысленні этнасу пачалі замацоўвацца пэўныя локусы і вобразныя стэрэатыпы, набываючы пры гэтым сакральнасць. У карціне свету з'явіліся вызначальныя, характарыстычныя, сістэмаўтваральныя вобразы-сімвалы. Нёман – адзін з такіх значных пейзажных вобразаў, з якім у беларускім паэтычным мысленні звязана ідэнтыфікацыя нашай этнапрасторы.

Ці не першы звярнуўся да Нёмана А. Міцкевіч у сваім славутым санеце, прысвечаным рацэ маленства. З польскамоўных літаратараў нельга абмінуць мастацка-творчае адкрыццё беларускай прыроды Элізай Ажэшкай (1841–1910), якая выявіла індывідуальна-аўтарскае, у сваёй аснове вельмі паэтычнае, успрыманне прыгажосці Нёмана, яго краявідаў. У гэтай сувязі нельга недаацэньваць польскамоўную літаратуру пра наш край, на тэму малой радзімы і яе прыроды, і ў першую чаргу творчасць Э. Ажэшкі, знакавай пісьменніцы прынёманскага краю. Ажэшка па-мастацку ярка адкрыла і вобразна апаэтызавала Нёман як унікальны, адметны і непаўторны свет, прэзентавала яскравае візуальна-эстэтычнае асваенне наднёманскай прыроднай прасторы, з якой спалучаны тонкімі духоўнымі (унутранымі) ніцямі чалавек, яго думкі, настроі, перажыванні.

«Краёвая» рэальнасць, рэгіянальны пейзаж шырока прадстаўлены ў творчасці Э. Ажэшкі. Нёман – па сутнасці адзін з герояў аповесці «Хам».

[3] Я. Колас, Збор твораў: У 20 т., Мінск, 2007, т. 1, с. 169, 170.
[4] Тамсама, с. 170.
[5] В. Каваленка, Міфапаэтычныя матывы ў беларускай літаратуры, Мінск, 1981, с. 21.

Пісьменніца стварае адухоўлены і маляўнічы вобраз гэтай ракі. Яна паэтызуе прыгажосць Нёмана, захапляецца прынёманскімі краявідамі, пра што сведчаць многія прыродаапісальныя замалёўкі ў структуры твора. Вось адна з самых цудоўных пейзажных карцін, якая ў тэкставым увасабленні аўтара аповесці нагадвае вобразна-паэтычны, лірычны жывапіс словам:

«А па Нёмане, які нагадваў неаглядны паток расплаўленага серабра, плылі крыгі, падобныя на пагоркі і дамочкі з крышталю. Дзе-нідзе ля берага, пад тоўстым покрывам лёду, чутно было кіпенне і бурчанне заняволенай вады, але шырокай сярэдзінай Нёмана то гуртам і шпарка, то паасобку і павольна плылі крышталёвыя крыгі, ззяючыя, празрыстыя, пазалочаныя праменнямі сонца або палітыя барвамі вясёлкі. Крыг гэтых было такое мноства, што яны здаваліся фантастычным шматлікім натоўпам, які паспешліва і маўкліва ўцякае з нейкіх невядомых краін. Згрудзіўшыся на дальнім канцы ракі, яны нагадвалі казачны горад з высокімі вежамі і дахамі, а на другім канцы ракі такі самы ледзяны горад разбіваўся на дробныя часткі і ўкрываў сярэбраны шлях Нёмана. А ў паветры стаяла ўрачыстая цішыня, скрозь холад прабівалася кволае і няўстойлівае цяпло, і пахла ўжо адталай зямлёй, якая пачынала вольна дыхаць пад рэшткамі снегу…

Вось і цяпер, убачыўшы крыгі, што плылі па рацэ, ён спыніўся і нават усклікнуў, нібы бачыў іх упершыню ў жыцці… Заўважыўшы крыгу, падобную да шкляной каплічкі і ззяючую вясёлкавымі фарбамі, ён доўга ківаў галавой:

– Ой якая прыгожая!»[6].

Нёман у аповесці «Хам» – сістэмаўтваральны пейзажны вобраз, цэнтр духоўнага і эстэтычнага прыцягнення. У мастацкай тканіне пра гэта сведчыць паўтаральнасць, пастаянная прысутнасць вобраза-гідроніма, уключанасць яго ў духоўны свет чалавека: «Нізка над гарой толькі Нёман пабліскваў сталёвай паласой…»[7]; «…Нёман коціць пад ветрам свае цёмныя і ўспененыя хвалі»[8]; «…перад вачыма Паўла паўставала раптам чыстая і ціхая блакітная вада, такая, якая бывае ў Нёмане ў яснае надвор'е…»[9]; «…вакол яго чуўся шумны і няспынны спеў быстрай, бурлівай вады»[10] і інш.

[6] Э. Ажэшка, Выбраныя творы. Уклад., прадм. і камент. В. Гапавай, Мінск, 2000, с. 310.
[7] Тамсама, с. 280.
[8] Тамсама, с. 222.
[9] Тамсама, с. 301.
[10] Тамсама, с. 346.

Герой твора Павел Кабыцкі імкне «на вольнае паветра, на быструю, бурлівую ваду»[11], любіць сузіраць «неабсяжныя прасторы Нёмана і далёкі краявід»[12]. Яму, нёманскаму рыбаку-беларусу, Э. Ажэшка перадала ўласнае ўспрыманне і бачанне прыроды Панямоння, свае тонкія назіранні, эстэтычныя ўражанні і пачуцці. Яна духоўна ўзвышала вясковага рыбака праз пачуццё еднасці з прыродай, родным краем. Пейзажны вобраз ракі – неад'емная частка светасузірання, светапогляду і жыццёвага лёсу персанажа. Аднак Нёман для героя Э. Ажэшкі не проста спадарожнік жыцця, рака стала неад'емнай часткай яго самога, ягонай духоўнай існасці: «Яны доўга дзівіліся з Паўла. Яны не ведалі, што ў крыві гэтага чалавека, з выгляду спакойнага, як Нёман у ціхае надвор'е, закіпела першая ў жыцці страсць, што ў сэрцы яго, як Нёман, глыбокім і ціхім, нарадзілася бязмежнае адчуванне, што перад позіркам яго, які прывык аглядаць неабсяжныя прасторы Нёмана і далёкі краявід, паўстала святая і высакародная чалавечая задача і асвяціла яго аблічча»[13].

Павел Кабыцкі, нёманскі рыбак-селянін, кажа, што для яго «рака жонка»[14]. Ужо абраны ім занятак зрабіў яго прыродным чалавекам. Пасля герой аповесці зноў паўтарае гэтую думку, гаворыць Францы: «…гэта рака ўсё жыццё была маёй жонкай»[15]. Усім сэрцам звычайны, просты беларус аддаsuccessfully роднаму кутку. Пародненасць яго з Нёманам, прыродным улоннем глыбокая, крэўная, нават інтымная. «Ён ведаў, дзе вада ў Нёмане глыбокая, а дзе мелкая, у якім месцы дно камяністае, а ў якім услана пяском або доўгімі водарасцямі»[16]. Унутраны свет беларуса знітаваны душой і сэрцам з родным краем, нёманскімі краявідамі, галоўнай стыхіяй яго жыцця. Пісьменніца так кажа пра свайго героя: «Ён любіў прыроду тою магутнай любоўю, якая прымушае дзіця, што не ўмее яшчэ вымавіць імя маці, вуснамі і рукамі цягнуцца да яе грудзей… Аднак апрача гэтай вялікай любові да прыроды, Паўла заўсёды агортвала захапленне, калі ён назіраў яе розныя з'явы»[17]. Герой ставіцца да ракі нібы да жывой, ён чуйна рэагуе на прыгажосць, розныя знешнія праявы навакольнага свету, і найперш на тое, як пачувае сябе рака, як мяняецца яе выгляд, стан, настрой.

[11] Тамсама.
[12] Тамсама, с. 286.
[13] Тамсама.
[14] Тамсама, с. 262.
[15] Тамсама, с. 293.
[16] Тамсама.
[17] Тамсама, с. 310.

Раман Э. Ажэшкі «Над Нёманам»[18] – вялікае эпічнае палатно, дзе асабліва́е, выключна важнае месца належыць апісанням воднай прасторы, навакольнага ландшафту, беларускай прыроды. Рака тут і канкрэтны геаграфічны топас, і лірычны фон дзеяння, і аб'ект паэтызацыі, з якім звязаны цэлы спектр матываў. Нёман і яго краявіды знаходзяцца ў пастаянным візуальна-выяўленчым працэсе адлюстравання, і гэтае мастацкае ўвасабленне багатае на дэталі, колеры, фарбы. Вобраз ракі атрымаўся шматстайны і шматмерны.

Топас Нёмана стаў фактарам і сімвалам нацыянальнай ідэнтыфікацыі. Цікавай у гэтай сувязі ўяўляецца трактоўка вобраза Нёмана ў паэзіі Ларысы Геніюш (1910–1983). Яна таксама прыналежная да прынямонскага этнарэгіёну. Паэтка нарадзілася ў Жлобаўшчыне на Гродзеншчыне. Вучылася ў Ваўкавыскай польскай гімназіі, а ў пасляваенны час доўгі час жыла ў Зэльве. Вобраз Нёмана ад самага пачатку ўвайшоў, можна сказаць, укараніўся ў паэтычную свядомасць Л. Геніюш. Паэтка ў вершы «Нёмне» так сказала: «…мой дружа з гадоў тых дзяцінных»[19]. Як і для Э. Ажэшкі, Нёман стаў неад'емнай часткай духоўнага жыцця і светаразумення Л. Геніюш, яе пакутлівых роздумаў і глыбокіх перажыванняў. Мастацкае адкрыццё і духоўнае спасціжэнне нацыянальнага свету пачыналася, апрача іншага, і з паэтызацыі, рамантычнага ўзвышэння вобраза Нёмана. З 1937 года паэтка жыла за межамі Беларусі, у далёкай Празе. У згадках вяртаючыся да нядаўняга мінулага, яна выказвае свой элегічны настрой з думкай пра дарагі сэрцу вобраз ракі: «…адзвінелі, як колас той летам, // залатыя над Нёманам дні»[20]. Ці вось яшчэ радкі з верша «Лятуць гусі», у якім таксама ўвасоблены шчымлівыя настальгічныя пачуцці па радзіме: «Па-над Нёмна шляхам водным // вольна пралятаць…»[21]. І надалей яна будзе працягваць гэтую духоўна-эстэтычную традыцыю паэтызацыі родных краявідаў, вобраза Нёмана і ўзбагачаць яго змястоўнае, ідэйна-філасофскае напаўненне.

Паэтка ўмела бачыць прыгожае, дзівоснае, непаўторнае і выявіць яго. Праз эстэтызацыю, пафас замілаванасці, любавання паэтка стварала натхнёны хваласпеў бацькоўскай зямлі, яе хараству. Родная прырода суцішвала, лекавала збалелую, спакутаваную душу: «Вецер да Нёмневай сіні прыпаў, // вод люстра у дробязі крышыць, // спакойныя хвалі

[18] Э. Ажэшка, Над Нёманам. Пер. з пол. мовы і камент. А. Бутэвіча, Мінск, 2003, 444 с.
[19] Л. Геніюш, Выбраныя творы. Уклад., прадм. М. Скоблы, Мінск, 2000, с. 54.
[20] Тамсама, с. 28.
[21] Тамсама, с. 34.

разгойдаў, узняў // і ціха калыша, калыша»[22]. Свой прынямонскі край паэтка хацела бачыць як зямны рай. Ужо ў творах першапачатковага перыяду Нёман неадлучны ад рамантычнага вобраза «Краіны шчасця». Паэтцы мроілася, уяўлялася шчаслівая будучыня: «Заварожыш Нёмнам, рэкамі сваімі, // засмяешся ў сонцы збожжам залатым…»[23].

Аднак рамантычныя летуценні перакрэсліла суровая рэчаіснасць, вайна, да таго ж паэтцы выпалі вялікія ўскладненні і выпрабаванні, выкліканыя няволяй у сталінскіх лагерах. Трагедыя народа была і яе ўласнай трагедыяй. У «хмарны дзень» вайны бяду і боль радзімы, яе люду ўвабрала ў сябе і беларуская рака: «…Край мой любы стогне, // кроў у воды Нёмну жыламі цячэ»[24]. Беларускі Край, яго лёс – вось самае галоўнае, што турбавала паэтку ў час вайны. Абаронча-змагарніцкі, вызваленчы пафас Л. Геніюш выявіўся праз паэтычныя звароты да Нёмана, думкі, адрасаваныя гэтай магутнай рацэ Краю. Прамаўленне яе ўсхваляванае, узрушанае, палымянае, прасякнута моцнай энергетыкай. У светаўспрыманні паэткі Нёман атаясамліваецца з легендарным волатам-асілкам. Верш «Нёмне» (1942) пачынаецца строфамі з падкрэсленай эпічнай паэтызацыяй прыгажосці і велічы галоўнай ракі беларусаў. З пачуццём узнёслага захаплення суседнічае, чаргуецца пафас гераізацыі і патрыятычнай паэтызацыі Нёмана як змагара, сына-абаронцы роднай Беларусі: «…бы волат, бы верны зямлі нашай сын, // на помач устанеш Краіне»; «Крывіч ты дастойны, ты волаце наш, // калыш народнае імя!»[25]. Твор заканчваецца аптымістычным услаўленнем ракі як сімвала нязломнасці свабодалюбнага духу і няспыннага руху жыцця: «Гэй, Нёмне, шырокі, як лён, галубы, // Кроў сіняя любай Краіны! // Вясёлы ля берагу, срогі ў глыбі, // імклівы, у бегу няўпынны»[26]. Нёман і прынямонскі край стаў для беларусаў, як і для «людзей… над Нёманам» у часы Э. Ажэшкі, месцам барацьбы і змагання, цяжкіх выпрабаванняў і пакут.

Нёман у паэтычным светаразуменні Л. Геніюш – беларускі канцэпт нацыянальнай мадэлі свету, сакральны цэнтр ландшафтна-прасторавага ўладкавання роднага Краю, стрыжнявая аснова яго непарушнасці і трываласці. Разам з тым гэта па сутнасці вобразная алегорыя, вобраз-пейзаж, які набываў у мастацкай трактоўцы сімвалічнасць. Нёман – маркер нёманскага краю, свайго роднага, самабытнага, спрадвечнага,

[22] Л. Геніюш, Белы сон: Вершы і паэмы. Уклад. і прадм. Б. Сачанкі, Мінск, 1990, с. 93.
[23] Л. Геніюш, Выбраныя творы, с. 28.
[24] Л. Геніюш, Белы сон, с. 47.
[25] Л. Геніюш, Белы сон, с. 54.
[26] Тамсама, с. 55.

«крывіцкага», гэта значыць беларускага. Ён – увасабленне аўтарскай філасофіі беларускага характару (верш «Нёман»):

Сіні, вольны, спавіты туманам,
Беларускі гусляр ад вякоў,
Мужным сэрцам ў свой Край закаханы,
Найвярнейшы, найлепшы з сыноў.

Абвіваеш зялёныя грудзі
Задумёных лясоў і далін,
Сэрцы сёлаў калышаш і будзіш
Звонкай хваляй з суровых глыбінь[27].

Лірычная гераіня Л. Геніюш пазіцыянуе сябе: «З беларускай учэпістай гліны // і з рабра прынямонскіх вярбін…»[28]. Паэтка так кажа пра ўнутраны гарт, які перадаўся ёй і ад роднай прыроды. Нёман заўсёды быў для Л. Геніюш сімвалам прыгажосці, паўнаты і сапраўднай каштоўнасці жыцця. Нездарма яна дала назву зборніку паэзіі «Невадам з Нёмана» (1967). Калі паэтка выбірала варыянт загалоўка зборніка пазнейшага часу, то быў варыянт «З рабра прынямонскіх вярбін». У гэтай сувязі яна пісала ў лісце да Дануты Бічэль ад 6 снежня 1979 г. пра важнае для яе, пра тое, што «мае сувязь… з зямлёю, і тою сілаю, якую дае чабор…»[29]. Духоўную сілу ёй даваў і родны Нёман, натхняў на высокі і ўзнёслы пафас прамаўлення. Нёман, можна сказаць, быў індыкатарам стану Краю, пачування сябе ў тагачасных абставінах: «Ад сухавеяў, што з усходу, // плытчэе Нёман у берагах, // душа малее у народу, // мрэ песня, як падбіты птах»[30]. У гэтых радках з верша «Не пазнаю цябе, мой Краю…» паэтка ўвасобіла ідэю экалогіі беларускай душы, не прымала яе абмялення і здрабнення, інакш кажучы, гаварыла пра магчымы духоўны заняпад, страту нацыянальнай ідэнтычнасці.

Пейзажны вобраз Нёмана вельмі арганічна, глыбока і трывала ўвайшоў у духоўны свет і творчасць Дануты Бічэль, адной з таленавітых беларускіх паэтак. Сялянская дзяўчына з Лідчыны, якая нарадзілася ў вёсцы Біскупцы, доўгі час жыве і працуе ў Гродна, у горадзе, дзе тварыла і яе славутая папярэдніца Э. Ажэшка. І менавіта ёй лёсам было наканавана стаць натхнёнай пясняркай Нёмана, якая апаэтызавала і ўславіла раку

27 Тамсама, с. 117.

28 Тамсама, с. 135.

29 Асоба і час: Беларускі біяграфічны альманах, вып. 3: Ларыса Геніюш. Уклад., прадм. і камент. М. Скоблы, Мінск, 2010, с. 145.

30 Л. Геніюш, Выбраныя творы, с. 108.

свайго жыцця. Магчыма, гэта было абумоўлена і запраграмавана нават месцам яе нараджэння: «Зусім недалёка ад Ліды, у фальварку Пешчын, нарадзілася Алаіза Пашкевіч, Цётка, у нашай вёсцы пра гэта ведалі. З другога боку, за Нёманам, вырас Адам Міцкевіч – а мой бацька ў сваёй мужыцкай хаце меў яго кнігі!»[31]. У вершы «Вёска Біскупцы» паэтэса так гаворыць пра родны кут, пра раку, якая стала для яе калыскай: «Нёман тут не цячэ, здаецца, // ён танцуе між берагоў…»[32].

Ларыса Геніюш, старэйшая па ўзросце за Дануту Бічэль, жывучы ў Зэльве, ліставалася з гарадзенскай паэткай, у вершы-прысвячэнні звярталася да яе «дарагая, харошая, // маладзенькі праменьчыку наш» і, усцешаная, шчыра радавалася: «…ў кожнай песні, бы Нёман, свая»[33]. У тым тэксце ёсць вельмі красамоўны радок: «…ганаровая Нёмнава страж»[34]. «Страж» – гэта слова ўжыта ў высокім разуменні: ахоўнік, абаронца. Гэткім духоўным вартавым беларускага Нёмана была найперш Л. Геніюш. Праз усё сваё жыццё, можна сказаць, да апошніх дзён творчасці. І яе нацыянальна-духоўную традыцыю, нібы творчую эстафету, падхапіла Данута Бічэль.

Адзін з першых зборнікаў Д. Бічэль атрымаў падкрэслена сімвалічную назву «Нёман ідзе» (1964). Нёман-рака ўваходзіць у яе лірычны свет як жывы, дзейны, актыўны герой, і гэтая персаніфікацыя ў народна-фальклорнай традыцыі выяўляе вельмі характэрную рысу светаўспрымання паэткі: бачыць у акаляючай прыродзе роднаснае, духоўна блізкае. У вершы «Каложа» створаны дынамічна-рухомы пейзаж ракі:

А Нёман цячэ сабе ўдаль,
як звычайна,
стагоддзямі вербы да хваль
прыручае,
жартуе і лашчыць,
пяшчотны залішне,
над кручай закруціць нядобрыя мыслі,
свавольную думку знайсці дапаможа...[35]

Рака, нібы чалавек, у руху, пошуку, яна надзелена рысамі натуры чулай і вольнай у сваіх памкненнях, дзеяннях. Такая існасць сугучная думкам, духоўнай існасці паэткі.

[31] Д. Бічэль, Снапок: Выбраныя вершы, Мінск: Маст. літ., 1999, с. 6.
[32] Тамсама, с. 154.
[33] Л. Геніюш, Белы сон, с. 96.
[34] Тамсама.
[35] Д. Бічэль, Снапок, с. 205.

Нёман-рака для Д. Бічэль – крыніца цэлага багацця эстэтычных уражанняў і эмоцый. У лірыцы паэткі шмат асацыяцый, параўнанняў, метафарычных эпітэтаў, арыгінальна ўвасобленых мікравобразаў і матываў, звязаных з пейзажным топасам Нёмана: «Ў Неманіне, бы лыжка ў місе, // патанула лясное рэха»[36]; «Красак і промняў яснота. // Нёман у сонечным німбе»[37]; «Заснуў і не цячэ амаль // да ўсіх замілаваны Нёман»[38]; «такое ласкавае, цёплае, чыстае, // як сонца, агніста, як Нёман, празрыстае…»[39]; «Пацішэў бору гоман. // Плытчэе задумлівы Нёман. // Не хлябчы яго, летняе сонца»[40] і інш. Гэтак, як і Э. Ажэшку, Д. Бічэль вабіць час вясновага адраджэння ракі, пейзажныя выявы пры гэтым у яе творах атрымаліся па-свойму адметныя: «А на Нёмане – // крыгаход! // Крыгі-востравы, // нібы роздумы...»[41]; «Крыгаломам ачысціўся Нёман, // і каменне з плячэй – крыгаломам, // і з душы смецце ў хвалі ракі!»[42]. Як бачым, Нёман – неад’емны атрыбут паэтычнага мыслення Д. Бічэль, ключавы вобраз-пейзаж у яе лірычнай творчасці.

У вершы «Краю мой Нёман» паэтка гаворыць пра раку як шлях, духоўны арыенцір жыцця і творчасці: «Хмельны ад гулу паводкаў, // ты не змялееш ніколі, // шлях маіх продкаў, // шлях маёй споўненай долі»[43]. Звяртае ўвагу падкрэслена рамантычная паэтызацыя моцы і велічы Нёмана, які валодае незвычайнай сілай. Ён – надзейнае апірышча, нібы мужчына-рыцар: «І Нёман свае магутныя плечы // падставіў мне»[44]. Больш за тое, гэтая рака – месца спрадвечнае, сакральна-святое, якое абуджае ўзнёслы стан духу, пачуццё свабоды і годнасці, кліча да ўнутранага ачышчэння і ўзвышэння. Верш «Перад Нёманам» пачынаецца са слоў палымянага звароту: «Дужым, высокім, відушчым // дробныя справы закрэсь, // выйдзі ты з вольнае пушчы – // вольны, як Нёман увесь»[45]. Стаўленне Д. Бічэль да ракі пашаноўнае: «бацька Нёман»[46]. Разам з тым Нёман нагадвае хлопца-зуха: «Нёман прытокі-

[36] Тамсама, с. 92.
[37] Тамсама, с. 224.
[38] Тамсама, с. 252.
[39] Тамсама, с. 292.
[40] Тамсама, с. 320.
[41] Тамсама, с. 105.
[42] Тамсама, с. 96.
[43] Тамсама, с. 201.
[44] Тамсама, с. 177.
[45] Тамсама, с. 278.
[46] Тамсама, с. 181.

дзяўчат абнімае…»[47]. Лірычнай гераіні паэткі ўласціва глыбока асабістае, інтымнае ўспрыманне свету, пры якім пераважае пачуццё шчырай непасрэднасці, замілавання, пяшчоты: «А яшчэ не выспалася галава, // пабягу, каб Нёман нацалаваў»[48]. Таму яна звяртаецца да Нёмана, нібы да каханага. Нельга адступіцца, адрачыся ад таго, што любіш, з чым спалучана доля, шчасце, надзея. «Перад Нёманам» паэтка спавядаецца, узіраецца ў яго плынь, нібы ў чыстае люстэрка, каб выбраць правільны жыццёвы кірунак і не стаць на шлях падманны, здрадлівы. Безумоўна, для Д. Бічэль, як і ў свой час для Э. Ажэшкі ці Л. Геніюш, Нёман – улюбёны пейзажны вобраз, увасабленне непаўторнай беларускай красы, высокі духоўна-эстэтычны ідэал.

Нёман больш чым рака, рэгіянальны топас, гэты вобраз-гідронім вырастае да сакральнага сімвала Радзімы. У вершы «Наш край» Нёман улучаны ў грамадзянска-патрыятычную канцэпцыю быцця, ён з’яўляецца духоўным апірышчам нацыі, адным з галоўных сэнсаўтваральных вобразаў-кодаў: «Мы не можам жыць без Краю. // Мы не можам – хата з краю. // Наша хата, наш парог. // З намі Нёман, з намі Бог»[49]. У гэтых радках Д. Бічэль дасягае высокай, узнёслай паэтызацыі нашай нацыянальнай карціны свету.

Такім чынам, Э. Ажэшка была адным з першых літаратараў, хто па-майстэрску паклаў пачатак паэтызацыі, мастацкай традыцыі жывапісання словам беларускага Панямоння і ўвасаблення галоўнага пейзажнага вобраза гэтага этнарэгіёну – ракі Нёман. Эстэтыка пейзажу, яго ідэйнае гучанне, экспрэсіўная выяўленчасць у паказе роднага краю прыкметна ўзбагаціліся ў лірыцы Л. Геніюш і Д. Бічэль, выдатных прадстаўнікоў гродзенскага Панямоння, нашай беларускай паэзіі і літаратуры. Яны па-свойму ярка, адметна прадоўжылі традыцыю паэтызацыі бацькоўскага краю, роднай прыроды, яе красы, уславілі Нёман як мясціну выключнай прыгажосці і духоўнай значнасці. Нёман у прасторы іх творчасці з’яўляецца ідэяўтваральным цэнтрам, тым канцэптуальным вобразам, з якім спалучана цэлае кола важных ментальных сэнсаў і інтэрпрэтацый.

[47] Тамсама, с. 278.

[48] Тамсама, с. 157.

[49] Д. Бічэль, Нядзелька: Вершы, Гродна, Гродзен. маладзёжны «Альянс імя Вітаўта Вялікага»; Гродзен. абл. аб’яднанне «Ратуша», 1998, с. 81.

**Літаратура**

Э. Ажэшка, Выбраныя творы. Уклад., прадм. і камент. В. Гапавай, Мінск, Беларус. кнігазбор, 2000, 512 с.

Э. Ажэшка, Над Нёманам: Раман. Пер. з пол. мовы і камент. А. Бутэвіча, Мінск, Маст. літ., 2003, 444 с.

Асоба і час: Беларускі біяграфічны альманах, вып. 3: Ларыса Геніюш. Уклад., прадм. і камент. М. Скоблы, Мінск, Лімарыус, 2010, 456 с.

Бацька наш Нёман: Вершы, апавяданні, нарысы, эсэ. Уклад. Я. Хвалей, Мінск, Юнацтва, 2001, 510 с.

Д. Бічэль, Нядзелька: Вершы, Гродна, Гродзен. маладзёжны «Альянс імя Вітаўта Вялікага»; Гродзен. абл. аб'яднанне «Ратуша», 1998, 87 с.

Д. Бічэль, Снапок: Выбраныя вершы, Мінск, Маст. літ., 1999, 446 с.

Л. Геніюш, Белы сон: Вершы і паэмы. Уклад. і прадм. Б. Сачанкі, Мінск, Маст. літ., 1990, 351 с.

Л. Геніюш, Л. Выбраныя творы. Уклад., прадм. М. Скоблы, Мінск, Беларус. кнігазбор, 2000, 618 с.

В. Каваленка, Міфапаэтычныя матывы ў беларускай літаратуры, Мінск, Навука і тэхніка, 1981, 318 с.

Я. Колас, Збор твораў: У 20 т., Мінск, Беларус. навука, 2007, т. 1, 622 с.

Я. Купала, Поўны збор твораў: У 9 т., Мінск, Маст. літ., 1995, т. 1, 462 с.

**Aleś Bielski**
*Białoruski Uniwersytet Państwowy w Mińsku*

## ELIZA ORZESZKOWA I POETYZACJA NIEMNA W LIRYCE BIAŁORUSKIEJ

Artykuł jest skoncentrowany wokół toposu Niemna jako znaku podstawowego i tworzącego sens w systemie myślenia o krajobrazie pisarzy i poetów Białorusi od czasów Adama Mickiewicza i Elizy Orzeszkowej. Ta rzeka jest w liryce XX wieku obiektem poetyzacji, obrazem i symbolem patriotycznym, wskaźnikiem duchowym białoruskiego obrazu świata. Szczególne znaczenie duchowe i wieloznaczność poetycką obraz Niemna osiągnął w twórczości Ł. Geniusz i D. Biczel, które są najbardziej reprezentatywnymi twórcami kraju nadniemenskiego.

**Słowa-klucze:** Orzeszkowa, Niemen, krajobraz, motywy krajobrazowe, zarysowanie krajobrazu, natura, szkic przyrodniczy, topos, przestrzeń, poezja, liryka, Geniusz, Biczel.

**Aleś Bielski**
*Belarusian State University*

**ELIZA ORZESZKOWA AND THE POETISATION OF THE NIEMEN IN BELARUSIAN POETRY**

**Summary**

The paper focuses on the topos of Niemien as the basic and meaning-making element in the system of thinking of Belarusian writers and poets about landscape since Adam Mickiewicz and Eliza Orzeszkowa. In the 20th century poetry, this river is an object of poetization, a patriotic image and symbol, a spiritual indicator of Belarusian image of the world. The image of Niemen achieved a particular spiritual meaning and poetic complexity in the works of L. Hienijuš and D. Biczel - the most representative poets of the Niemen region.

**Keywords**: Orzeszkowa, Niemen, landscape, landscape motifs, outlining the landscape, nature, impression of nature, topos, space, poetry, Hienijuš, Biczel.